СУСТРЭНЕМ ЮБІЛЕЙ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ НОВЫМІ ПОСПЕХАМІ
Ў ВУЧОБЕ І НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯХ!

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 28 (680) ● 6 кастрычніка ПЯТНІЦА ● Цана 2 кап. Год выдання XX.



Для выпускнікоў універсітэта наступіў адказны момант вучобы — падрыхтоўка дыпломных работ. Многа сіл яна патрабуе асабліва ад тых, хто працуе над тэмамі, звязанымі з эксперыментамі. На гэтым здымку вы бачыце пяцікурсніка з біяфака Барыса Нартыша ў лабараторыі. Лабараторыя цяпер стала для яго другім домам.

Фота А. Кадзета.

## ВЫСОКІЯ РУБЯЖЫ

Вялікую цікавасць у нашым універсітэце выклікала Пастанова ЦК КПСС «Аб мерах па далейшаму развіццю грамадскіх навук і павышэнню іх ролі ў камуністычным будаўніцтве». Кафедры і выкладчыкі зраўніваюць з ім свае справы і планы, намячаюць канкрэтныя меры па правядзенню яго ў жыццё. Распрацаваная ЦК КПСС праграма далейшага развіцця грамадскіх навук і павышэння іх ролі, па-сутнасці, з першага дня новага навучальнага года паложана ў аснову педагагічнай і навукова-даследчай дзейнасці філосафаў, гісторыкаў, юрыстаў, філолагаў. А зараз на кафедрах абмяркоўваюцца і зацвярджаюцца перспектыўныя планы. Днямі такі разгорнуты план прыняты кафедрай гісторыі філасофіі і логікі.

У ім вызначаны галоўныя кірункі і канкрэтныя задачы работы гэтага вялікага калектыва выкладчыкаў. У прыватнасці, у галіне навуковых даследаванняў вырашана прадоўжыць і расшырыць вывучэнне гісторыі філасофіі, сацыялогіі і грамадска-палітычнай думкі Беларусі XVI—XX стагоддзяў, з тым, каб у бліжэйшыя гады стварыць па гэтай тэме двухтомную працу. Акрамя таго, як і патрабуе Пастанова ЦК КПСС, на кафедры будзе працягнута даследаванне развіцця марксісцкай думкі ў сацыялістычных краінах. Па ўказанай праблематыцы завяршаецца падрыхтоўка адной доктарскай і адной кандыдацкай дысертацый. Члены кафедры рыхтуюць некалькі манаграфій па актуальных праблемах эстэтыкі, этыкі, навуковага атэізма.

У асобныя раздзелы ўключаны мерапрыемствы ў галіне вучэбнай, ідэйна-выхаваўчай работы, падрыхтоўкі навуковых кадраў. На гэтай кафедры традыцыйным стаў такі метад кантролю за ўзроўнем выкладання розных дысцыплін, як арганізацыя адкрытых лекцый з наступным абмеркаваннем, а таксама абмеркаванне тэкстаў лекцый. Зараз вырашана практыкаваць выданне асобных лекцый па найбольш складаных тэмах для студэнтаў, метадычных дапаможнікаў. Кафедра адобрыла вопыт сістэматычнага абнаўлення тэматыкі кантрольных, курсавых і дыпломных работ, а таксама пытанняў, якія ўключаюцца ў экзаменацыйныя білеты. Выкладчыкам даручана падрыхтаваць і прадставіць на абмеркаванне матэрыялы спецкурсаў і спецсемінараў для студэнтаў-філосафаў і гісторыкаў, якія спецыялізуюцца па навуковаму атэізму.

Кафедра вядзе вялікую работу па падрыхтоўцы навуковых кадраў праз аспірантуру. Дастаткова сказаць, што толькі ў гэтым юбілейным годзе выхаванцамі кафедры падрыхтавана 9 кандыдацкіх дысертацый, дзве з якіх ужо абаронены. Павышэнню ўзроўня навуковай і педагагічнай падрыхтоўкі аспірантаў будуць садзейнічаць новыя мерапрыемствы кафедры і, у прыватнасці, прыцягненне аспірантаў, пачынаючы з другога курса, да чытання лекцый і правядзення семінарскіх заняткаў.

Чытачы нашай газеты ведаюць, што ў гэтым годзе за актыўны ўдзел у лекцыйнай прапагандзе сярод насельніцтва загадчык кафедры прафесар Іван Мікалаевіч Лушчыцкі ўзнагароджаны ордэнам Леніна, а дацэнт Сяргей Данілавіч Лапцёнак Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета БССР. Вялікую ідэйна-выхаваўчую работу сярод насельніцтва вядуць і іншыя члены кафедры. Канкрэтныя мерапрыемствы ў сувязі з Пастановай ЦК КПСС кафедра зацвердзіла і ў гэтай вобласці сваёй дзейнасці.

З усяго гэтага бачна, што кафедра вельмі сур'ёзна падышла да рашэння партыі, успрыняла іх, як кіраўніцтва ў разнастайнай паўсядзённай рабоце на вялікі перыяд. Пажадаем яе членам плённых творчых поспехаў.

А. ІГНАТОВІЧ.

### *Весткі з кафедр*

## ДАРАГІЯ СЯБРЫ!

Да вас наша слова, таварышы выкладчыкі, студэнты, супрацоўнікі універсітэта!

7-га лістапада вялікае свята. У гэты дзень спаўняецца 50 год Савецкай улады. Для нас, супрацоўнікаў універсітэта, студэнтаў, выкладчыкаў, 7 лістапада знамянальна яшчэ і тым, што ў гэты дзень — 20 год назад выйшаў першы нумар нашай шматтыражкі «Беларускі універсітэт».

Таму да вас, дарагія сябры, наша слова!

Што вам падабаецца на старонках нашай газеты (матэрыялы, ад. дзелы, рубрыкі) і што не падабаецца?

Што б вы яшчэ хацелі ўбачыць, якія тэмы неабходна ўзняць?

Чакаем вашых прапаноў.

Наш адрас: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт».

## РАШЭННІ ПАРТЫІ І УРАДА НА ПОДЗВІГІ КЛІЧУЦЬ

### АДКАЗВАЮЧЫ НА КЛОПАТЫ

Вестку аб Пастанове ЦК КПСС «Аб мерах па далейшаму паляпшэнню дабрабыту савецкага народа» я ўпершыню пачуў на працы. Нельга выказаць словамі ўсю моц той радасці і хвалявання, з якой я віншаваў сваіх таварышаў па рабоце.

Як радасна на душы, калі штодзённа адчуваеш клопаты і канкрэтныя меры, накіраваныя на паляпшэнне ўмоў жыцця працоўных.

З 1 студзеня 1968 года мінімальны размер заработнай платы рабочых і служачых павялічыцца да 60 рублёў у месяц. Гэта здорава! Маёй радасці, здаецца, няма межаў і гэта ад пачуцця таго, што нават пра мяне, простага вахцёра, думаюць наша Камуністычная партыя і Савецкі урад, клапоцяцца аб тым, каб стварыць усе неабходныя ўмовы для працы. Такое можа быць толькі ў нас, у Савецкай краіне, дзе ўлада належыць рабочым і сялянам.

У мяне, скажу гэта па шчырасці, удвоілася энергіі ў працы, здаецца, што мне нехта дабавіў некалькі дзесяткаў год жыцця. А гэта значыць, што я буду працаваць яшчэ лепш. За вялікія клопаты партыі і ўрада я адкажу самаадданай працай.

А. ШЫХ,
вахцёр.

### *САРДЭЧНАЯ ЎДЗЯЧНАСЦЬ*

*Пастанова вераснёўскага Пленума ЦК КПСС «Аб мерах па далейшаму павышэнню дабрабыту савецкага народа» выклікала ажыўленыя размовы на нашым курсе. Усе яны звodзіліся да таго, што кожны з нас з вялікай удзячнасцю і шчырым прызнаннем выказваў падзяку роднай партыі і ўраду за клопаты аб народзе. Многім бацькам маіх аднакурснікаў будзе павышана заработная плата, некаторым пенсія. Хіба гэта не можа радаваць! За такія клопаты КПСС і Савецкага ўрада хочацца адказаць старанной працай, выдатна закончыць ардэнаносны універсітэт, каб пасля высокакваліфікаваным спецыялістам ісці на вытворчасць, памнажаць працоўныя подзвігі краіны.*

*Я хачу ад шчырага сэрца сказаць Камуністычнай партыі і Савецкаму ўраду:*

*— Вялікае дзякуй!*

*А. ЛІПСКІ.*

## СТО СОРАК ТАМОЎ ЗАМОЦІНА

Янка Скрыган у «Сваёй аповесці» піша: «Канчаўся універсітэт, і рабілася шкада добрых настаўнікаў. Мы любілі Замоціна, Вальфсона, Піятуховіча, Фогта, Саўсуна».

Так, мы, студэнты двадцатых - трыццатых гадоў, любілі Івана Іванавіча Замоціна, любілі шчыра, аддана. Каля пяці тысяч друкаваных старонак па гісторыі літаратуры належыць пяру І. Замоціна. Яны не ўступаюць па сваіх вартасцях працам тых нямногіх прадстаўнікоў рускай літаратуры, якія ўжо з'яўляюцца членамі-карэспандэнтамі нашай Акадэміі навук», — так пісалі пра І. Замоціна дзеячы рускай культуры Я. Карскі, В. Перцаў, Б. Ляпуноў.

І. Замоцін нарадзіўся ў канцы 1873 года ў сям'і селяніна былой Цвярской губерні. Сярэднюю адукацыю будучы вучоны атрымаў ў Пецярбургу і Пскове, вышэйшую—у Пецярбургскім гісторыка-філалагічным інстытуце. У 1904 годзе ў Казанскім універсітэце І. Замоцін абараніў дысертацыю на ступень магістра рускай літаратуры. У гэтым жа годзе ён распачаў педагагічна - выкладчыцкую дзейнасць у Варшаўскім і Пецярбургскім універсітэтах. З 1908 года ён—доктар рускай славеснасці і прафесар Варшаўскага універсітэта.

У 1922 годзе Іван Іванавіч Замоцін быў запрошаны прафесарам беларускага дзяржаўнага універсітэта і па 1928 год выкладаў рускую літаратуру на рабфаку БДУ. Доўгі час І. Замоцін быў старшынёй літаратурнай камісіі педфака. У студзені 1925 года ён стаў сапраўдным членам Інстытута беларускай культуры, а са снежня 1928 года ён зацверджаны правадзейным членам (акадэмікам) Беларускай акадэміі навук. З 1931 года І. Замоцін працуе дырэктарам Інстытута літаратуры і мастацтва АН БССР, а пасля прафесарам кафедры літаратуры Мінскага Вышэйшага педагагічнага інстытута, дзе і давялося мне слухаць яго лекцыі.

Іван Іванавіч Замоцін плённа працаваў у галіне развіцця беларускай літаратуры. Крытычныя артыкулы акадэміка І. Замоціна «Шляхі развіцця беларускай літаратуры», «Драмы Я. Купалы», «Максім Багдановіч (Крытычна-біяграфічны нарыс)», «Творчасць Крапівы», «Янка Купала (Да трыццацігоддзя літаратурнай дзейнасці»), «Высокі ўзор мастацкага рэалізму (Аповесць Якуба Коласа «Дрыгва»)», «Лірыка Якуба Коласа 1930—35 гг.», «Аб паэме Якуба Коласа «На шляхах волі» сведчаць аб яго адданасці справе развіцця нашай роднай літаратуры.

Я. ГАВАРУШКА.

Смалявічы.

Партыйнае жыццё

# ПОСПЕХІ МАГЛІ Б БЫЦЬ ЛЕПШЫМІ

Камуністы матэматычнага факультэта трэцяга кастрычніка сабраліся на свой справаздачна-выбарчы сход, каб прааналізаваць работу партыйнага бюро за 1966—1967 навучальны год.

У дакладзе сакратара партбюро А. У. Самсонава было закранута шмат важных пытанняў вучобы студэнтаў, дысцыпліны, а таксама праблема падрыхтоўкі навуковых кадраў, выканання грамадскіх даручэнняў, работа камітэта камсамола, прафбюро і іншае.

Калі ўлічыць колькасны склад членаў КПСС на факультэце, то можна прыйсці да вываду, што для практычнай дзейнасці камуністаў ёсць вялікі абсяг. На матфаку 1240 студэнтаў. А камуністаў — 50, 10 з іх — студэнты. Гэта значыць, што кожны 124 студэнт — камуніст. Таму нездарма паднімалася пытанне і ў дакладзе, і ў спрэчках выступаючых аб яшчэ большай актывізацыі індывідуальнай работы кожнага члена КПСС сярод студэнтаў, з тым разлікам, каб з лепшых рыхтаваць дастойнае партыйнае папаўненне.

На васьмі сходах, пятнаццаці пасяджэннях, праведзеных членамі партбюро матфака на працягу года, неаднаразова вялася гутарка па пытаннях выхаваўчай работы сярод студэнтаў. Адзначалася, што значную работу ў гэтым сектары адыгрываюць куратары, якія ў сваіх групах неаднаразова праводзілі семінары на міжнародныя тэмы, арганізоўвалі палітінфармацыі, культпаходы ў розныя установы сталіцы. Асабліва заслугоўвае вялікай увагі работа куратараў Баскінай, Грыгор'евай, Булгаковай.

Студэнцкае жыццё даецца чалавеку адзін раз, і трэба зрабіць усё так, каб яго пражыць, як мага лепш, памятна і цікава. Куратары, выкарыстоўваючы багаты вопыт выхаваўчай работы, прывіваюць нашым студэнтам лепшыя прынцыпы жыцця савецкага чалавека, яго высокія маральныя і інтэрнацыянальныя пачуцці. Пачэснае месца тут займаюць гутаркі і чытанні аб слаўных рэвалюцыйных і працоўных традыцыях нашай партыі і народа.

На сходзе многімі выступіўшымі адзначалася, у прыватнасці, што добры плён у выхаванні юнакоў і дзяўчат дае таксама і наведванне прафесарска-выкладчыцкім калектывам інтэрнатаў. Як прыклад, адзначалася стараннe і актыўнасць у гэтым кірунку дацэнта А. Я. Бураўскага, крытыкаваліся тыя, хто рэдка наведвае жыллёвыя пакоі студэнтаў.

Канешне, не трэба перакрэсліваць на матэматычным факультэце і факт непасняховай вучобы некаторых студэнтаў. Прычынай гэтаму з'яўляецца тое, гаварылі выступаючыя, што сярод матэматыкаў ёсць шмат «лірыкаў», якія запоем чытаюць мастацкую літаратуру. Але на ўсё трэба мець свой час. Не трэба забываць і на праграмную літаратуру.

З абурэннем гаварылі камуністы-матэматыкі аб выключаным з універсітэта камуністу Аляшкевічу, які прысвоіў сабе чужыя грошы, а таксама пра 114 студэнтаў, маючых акадэмічную запазычанасць з летняй сесіі. Вось як выглядае дыяграма «хвасцістаў» па курсах: першы — 45, другі — 43, чацвёрты — 15. Як бачым, горшыя справы — на першым курсе. Гэта значыць, як збоку выкладчыкаў, так і з боку старшакурснікаў увага першаму курсу ўдзяляецца яшчэ недастатковая.

Рабіліся папрокі і ў адрас студэнтаў-вячэрнікаў, якія вельмі дрэнна наведваюць лекцыі.

Камуністы выказалі некаторыя карысныя прапановы наконт выкаранення ўсіх гэтых недахопаў.

Выкладчык Ф. Ф. Мухін прывёў канкрэтныя прыклады са сваёй практыкі выхавання.

Аднойчы ён разам са студэнтамі павінен быў зрабіць культпаход у музей. Але здарылася так, што прыйсці ў назначаны час не ўдалося. І студэнты не разгубіліся. Кіраўніцтва ўзяў на сябе камсорг, і важнае мерапрыемства было зроблена.

Справядлівых папрокаў на сходзе заслужылі аспіранты, якія інертна ўключаюцца ў грамадскую работу факультэта.

Прафесар Ф. Д. Гахаў у сваім выступленні зазначыў, што матфак яшчэ бедны навуковымі кадрамі. Нядрэнна, гаварыў ён, было б некаторым выкладчыкам даваць больш свабоднага часу для падрыхтоўкі дысертацый.

Многа было выказана на партыйным сходзе заўваг адносна развіцця на факультэце мастацкай самадзейнасці, стварэння наглядных ілюстрацый і стэндаў, якія б сведчылі аб поспехах і недахопах усяго факультэта.

Адным словам, сход праходзіў пад лозунгам дастойнай сустрэчы 50-годдзя Савецкай улады.

Уласна кажучы, юбілейны год матэматычнага факультэта быў годам дзейснай працы, новых творчых дасягненняў.

З гонарам выконваюцца сацыялістычныя абавязацельствы. Вучонымі факультэта падрыхтавана шмат вучэбных дапаможнікаў. Хутка будзе створана выстаўка навуковых прац. На факультэце працуюць тры навуковыя філасофскія семінары.

Многа добрых спраў і ў ліку камсамольскай арганізацыі факультэта. Сёлета на цалінных будоўлях працавала 138 матэматыкаў, на будоўлях Беларусі — таксама больш за 100.

Членам новага партыйнага бюро матфака прыдзецца ўдзяляць яшчэ большую ўвагу ліквідаванню недахопаў, развіццю самадзейнасці ўсіх камуністаў.

У склад партбюро сход выбраў найбольш актыўных, дзелавых людзей. Сярод іх—Е. Петушкова, А. Нахімоўская, А. Гусак, П. Манастырны, А. Філімонаў.

Ю. АГАРАДНІЧЭНКА.

## КРЫТЫКА ДАПАМАГАЕ

Аб рабоце прафсаюзнай аганізацыі універсітэта, прафгруп і прафбюро гаварылася на справаздачна-выбарчым сходзе адміністрацыйна - гаспадарчай часткі. З дакладам выступіў старшыня прафбюро В. М. Касачоў.

У прамове В. М. Касачова вялікая ўвага была ўдзелена верасnёўскаму Пленуму ЦК КПСС.

— Наш сход праходзіць напярэдадні знамянальнай даты — 50-годдзя Вялікага Кастрычніка, і мы рапартуем яму сваімі дасягненнямі.

Асноўныя функцыі работнікаў гаспадарчай часткі— гэта матэрыяльнае забеспячэнне усяго вучэбнага працэсу універсітэта. З галоўнымі абавязкамі калектыў работнікаў гаспадарчай часткі справіўся.

Член прафбюро В. С. Андрух адзначыў, што універсітэт з кожным годам становіцца усё прыгажэйшым. Вырас корпус радыёфізікі, у рыштаваннях новы хімічны корпус. Ва універсітэце першакласнае абсталяванне. А вось ці берагуць студэнты памяшканні, мэблю? Не зусім. Амаль у кожнай аудыторыі можна убачыць на партах чарнільныя плямы. Ёсць шмат паламаных крэслаў. Нажаль, прыбіральшчыцы, заўважаючы усё гэта, не даводзяць да ведама камендантаў карпусоў.

Многа гаварылася на сходзе і аб поспехах, якіх дабілася арганізацыя за справаздачны перыяд.

Для супрацоўнікаў адміністрацыйна-гаспадарчай часткі створана 13 палітшкол, актыўна праводзіцца падпіска на газеты і часопісы. Многім членам прафсаюза была аказана матэрыяльная дапамога. Добра клапацілася прафбюро і аб адпачынку гаспадарчых работнікаў. Толькі на пуцёўкі ў дамы адпачынку і санаторыі затрачана 2,5 тысячы рублёў.

Члены прафсаюза на сваім сходзе вызначылі многа канкрэтных планаў, якія будуць садзейнічаць паляпшэнню арганізацыі работы адміністрацыйна-гаспадарчай часткі.

А. ЦЕРАХОВІЧ.



*Лабараторныя заняткі ў хімікаў заўсёды праходзяць з вялікай цікавасцю. Што ні вопыт — новае адкрыццё. Колькі іх будзе яшчэ ў студэнта другога курса Анатоля Пуцікава, якога вы бачыце на пярэднім плане, пакуль ён атрымае дыплом выхаванца БДУ імя У. І. Леніна!*

*Фота Т. МАРОЗА.*

# ТРЫМАЙ АДКАЗ, ТАВАРЫШ КАМІТЭТ

З усіх юбілеяў краіны — 50-годдзе яе — для нас самае галоўнае і адказнае свята. Да яго рыхтуецца ўся краіна, увесь савецкі народ. Радыё і друк кожны дзень, кожную гадзіну прыносяць усё новыя і новыя весткі аб працоўных подзвігах нашых людзей. І мы адчуваем гэты энтузіязм, творчую ініцыятыву, адчуваем гонар за дасягнутае, бачым ясныя перспектывы на будучае.

У гэтых абставінах рыхтуе свае рапарты і наша маладзёжная арганізацыя. Ужо мы можам назваць багатыя лічбы і розныя факты аб слаўных справах універсітэцкай камсамоліі ў юбілейным годзе. Аднак вялікія лічбы і факты не павінны нараджаць у нас, моладзі, пачуццё самазаспакаення. Сканцэнтраваць нашу ўвагу на яшчэ нявырашаных праблемах — гэта лепшы падарунак Радзіме да свята.

Справаздачы і выбары ў нашай камсамольскай арганізацыі ўжо пачаліся. Прайшлі яны ў пярвічных арганізацыях першых курсаў. Цяпер пачынаюцца справаздачна-выбарчыя сходы другіх-чацвёртых курсаў.

Хацелася б, каб у гэтым годзе мы настолькі адышлі ад тых традыцыйна-трафарэтных рытуалаў у правядзенні справаздач і выбараў, каб сходы пачыналіся ці заканчваліся мітынгамі моладзі, ускладаннем кветак ля помнікаў Леніну, героям рэвалюцыі і Вялікай Айчыннай вайны, кінафільмамі і інсцэніроўкамі аб Леніне, аб слаўных справах і традыцыях камсамола.

Нядрэнна было б, каб у кожнай групе паслухалі кожнага камсамольца аб тым, якімі справамі сустракае ён юбілей краіны.

У аснову справаздачных дакладаў і прынятых рашэнняў павінны быць пакладзены Тэзісы ЦК КПСС да 50-годдзя Савецкай улады, нядаўнія пастановы партыі і ўрада.

У дакладах і ў выступленнях трэба смела ўскрываць недахопы арганізатарскай работы нашага камсамольскага актыва, яшчэ маючы месца фармалізм, безадказнасць за выкананне абавязкаў і абавязацельстваў некаторымі камсамольцамі.

Неабходна на прыкладах канкрэтна паказаць, дзе яшчэ дзелавітасць і баявое жыццё камсамольскай арганізацыі падмяняюцца парадным гулам і паказухай.

### Камсамольскае жыццё

На сходах павінны быць дакладна вызначаны канкрэтныя асноўныя задачы арганізацыі, улічваючы яе спецыфіку і магчымасці. З вопыту мінулых гадоў мы ведаем, што ў многіх арганізацыях планы работ і справаздачы, як дзве кроплі вады, падобны, хоць кожная арганізацыя мае свае спецыфічныя асаблівасці. Асноўную ўвагу трэба звярнуць на арганізатарскую работу па фарміраванню ў моладзі камуністычнага светапогляду.

На сходах неабходна таксама заслухаць справаздачы штабаў «КП» і рэдкалегій насценных газет, падвесці вынікі іх работы, крытычна падысці да іх дзейнасці, накіраванай на здзяйсненне пастаўленых перад камітэтам камсамола задач. Не сакрэт, што многія насценныя газеты не заўсёды шырока і шматгранна асвятляюць усе бакі камсамольскага жыцця. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на работу сярод камсамольцаў па выхаванню моладзі на слаўных рэвалюцыйных і баявых традыцыях нашага народа, партыі і камсамола. Заўвагі і прапановы радавых камсамольцаў дапамогуць пазбегнуць памылак, якія былі дапушчаны ў рабоце.

Плённасць работы камітэтаў камсамола вызначаецца не па тым, які справаздачны даклад напіша выступаючы, хоць і гэта важна, а сваімі дзелавымі якасцямі, уменнем арыентавацца ў практычнай і тэарэтычнай дзейнасці, псіхалагічным уздзеяннем на аўдыторыю, прыкладнымі паводзінамі сярод калектыва, патрабавальнасцямі да сябе.

Немалое месца ў справаздачных дакладах павінны заняць пытанні вучобы, навуковых даследаванняў, шэфскай работы студэнтаў сярод насельніцтва, ролі камсамола ў арганізацыі культурнага адпачынку моладзі, развіцці спорту, турызма і многа іншага.

Ярка і поўна трэба адлюстраваць факты маральнага і матэрыяльнага стымулу заахвочвання камсамольцаў. Кожны юнак ці дзяўчына павінны памятаць, што адміністрацыя заўсёды падтрымлівае і будзе падтрымліваць прапановы камсамольскіх органаў, аддаваць перавагу пры размеркаванні тым студэнтам, якія на працягу вучобы ва універсітэце прымалі актыўны ўдзел у грамадскай дзейнасці арганізацый.

Пры падборы камсамольскіх кадраў у зноў выбраныя камітэты трэба абапірацца на маладых камуністаў з ліку студэнтаў, бо не сакрэт, што ў нас мала камуністаў сярод сакратароў пярвічных камсамольскіх арганізацый.

Новавыбраным камсамольскім арганам трэба будзе ўважліва аднесціся да крытычных заўваг і прапаноў юнакоў і дзяўчат і прыняць па гэтых заўвагах і рэкамендацыях канкрэтныя меры і рашэнні, каб яшчэ больш палепшыць вучэбна выхаваўчы працэс, разнастаіць, зрабіць больш цікавым і шматгранным наша камсамольскае жыццё.

М. ЦІВА,
сакратар камітэта камсамола універсітэта.




Сорак два в'етнамскія студэнты, якія прыехалі ў канцы жніўня для вучобы на падрыхтоўчы факультэт нашага універсітэта, у гэтыя перадсвяточныя дні юбілейнага года асабліва цікавяцца гісторыка-рэвалюцыйнымі месцамі беларускай сталіцы.

Нядаўна яны наведалі Дом-музей І З'езда РСДРП. Тут некалькі год назад пабываў Прэзідэнт ДРВ Хо Шы Мін. Ён пакінуў свой поўны багатых уражанняў і ўдзячнасці запіс у Кнізе ганаровых гасцей.

НА ЗДЫМКУ: в'етнамскія студэнты падрыхтоўчага факультэта з групай выкладчыкаў ля Дома-музея І З'езда РСДРП па заканчэнню экскурсіі.

Фота студэнта пятага курса фізічнага факультэта Ле Міня.

# АЎДЫТОРЫІ ПАЛІТЫЧНАЙ АСВЕТЫ

Адбыліся першыя заняткі новага навучальнага года ў сетцы партыйнай вучобы нашага універсітэта. Яны паказалі, што ў юбілейным годзе яшчэ больш узрасла цікавасць камуністаў і беспартыйных да рэвалюцыйнай тэорыі.

Асабліва ўнушальным ва універсітэце з'яўляецца вышэйшае звяно палітычнай адукацыі. Па філасофскіх праблемах прыродазнаўства, мовазнаўства, метадычных пытаннях развіцця літаратуры і мастацтва і іншых актуальных раздзелах марксісцка-ленінскай тэорыі створан 21 семінар, працягваць вучобу ў якіх выявіла жаданне каля 700 чалавек. Багаты вопыт у вучобе і шырокую папулярнасць атрымаў семінар «Філасофскія праблемы сучаснага прыродазнаўства», якім бяззменна кіруе член-карэспандэнт АН БССР доктар філасофскіх навук В. І. Сцяпанаў. Выкладчыкі фізічнага, матэматычнага і хімічнага факультэтаў з вялікай цікавасцю вывучаюць тут тэарэтычныя пытанні, якія маюць важнае значэнне ў іх практычнай дзейнасці. І ў гэтым годзе семінар вырашылі наведваць 45 чалавек. Шмат слухачоў і ў семінарах па філасофскіх праблемах матэматыкі, хіміі, палітычнай эканоміі і эканамічнай палітыкі, праблемах нацыянальна-вызваленчага руху, міжнародных адносін. У ліку кіраўнікоў такія вопытныя прапагандысты, як доктары навук В. Г. Заўрыеў, Г. М. Трухноў, А. Е. Супрун, М. І. Крукоўскі, дацэнты А. В. Самускевіч, Е. В. Петушкова, В. А. Бадзяй, А. І. Ляўко, А. С. Кляўчэня, І. Т. Караленка, В. А. Дарогін, В. А. Внукава, А. Д. Гусеў. На працягу многіх год яны з'яўляюцца арганізатарамі палітычнай вучобы камуністаў і беспартыйных, самі выхавалі нямала прапагандыстаў. Не дзіўна, што пераняць у іх вопыт прыходзяць кіраўнікі гурткоў і семінараў прадпрыемстваў і устаноў Мінска.

Арганізавана прайшлі заняткі ў гуртках і школах сярэдняга і пачатковага звяна палітычнай адукацыі. У цэлым усімі формамі палітычнай вучобы ва універсітэце ахоплена каля 900 камуністаў і беспартыйных.

І. КРАСОЎСКІ.

## ШКОЛА РЭДАКТАРАЎ

**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА І РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ» ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ, ШТО ШКОЛА РЭДАКТАРАЎ НАСЦЕННЫХ ГАЗЕТ У ГЭТЫМ ГОДЗЕ ПРАЦЯГВАЕ СВАЮ РАБОТУ. ПАЧАТАК ЗАНЯТКАЎ 16 КАСТРЫЧНІКА У ПАМЯШКАННІ РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ», а 18 ГАДЗІНЕ.**

# ВЫВУЧАЕМ
## гістарычныя дакументы

Навуковыя веды, марксісцка-ленінская падрыхтоўка асабліва патрэбны студэнтам вну, якія пасля заканчэння вучобы павінны стаць не толькі выдатнымі спецыялістамі, але і ідэйна загартаванымі людзьмі, выхавацелямі.

Тэзісы ЦК КПСС да 50-годдзя Вялікага Кастрычніка заключаюць вялікую кіруючую сілу сацыяльнага развіцця, з'яўляюцца першакрыніцай, якая сведчыць аб працоўным і грамадскім удзеле савецкіх людзей у будаўніцтве камунізма. І не дзіўна, што ў гэтыя перадсвяточныя дні ў нашым ардэнаносным універсітэце асаблівая ўвага ўдзяляецца вывучэнню грамадскіх навук студэнтамі ўсіх факультэтаў. Выкладчыкі, дацэнты, прафесары кафедр гісторыі КПСС і навуковага камунізма з усёй адказнасцю праводзяць заняткі па Тэзісах ЦК КПСС.

Цікава і змястоўна праходзяць семінарскія заняткі на чацвёртым курсе факультэта журналістыкі, якія праводзіць дацэнт А. М. Паўлючэнка. Шчыра кажучы, лекцыі Анатоля Максімавіча слухаюць з вялікай ахвотай: у іх вельмі многа жывых фактаў з жыцця, учарашняга і сённяшняга, фактаў разнабаковых — палітычных, сацыяльных і эканамічных. Гэта дапамагае студэнтам добра рыхтавацца да заняткаў. Моцна адчуваюць сябе на практычных студэнты П. Пабока, А. Ліпскі, А. Гарбачоў і многа іншых.

Добра праходзяць заняткі па Тэзісах ЦК КПСС і на філалагічным факультэце. Высокую актыўнасць пры вывучэнні гэтага важнейшага гістарычнага дакумента праяўляюць першакурснікі чацвёртай групы аддзялення беларускай мовы і літаратуры. Заўсёды падрыхтаванымі да заняткаў прыходзяць студэнты Шэлест, Шабановіч, Садоўская, Шоцкая, Саковіч.

Студэнты універсітэта добра разумеюць, што вывучэнне Тэзісаў ЦК КПСС да 50-годдзя Савецкай улады — патрэбная і карысная справа для ўсіх.

І. МЯДЗЬВЕДЗЕЎ.

## З рэдакцыйнай пошты

# НА ПАРОЗЕ БУДЫЧЫНІ

**Да доўгачаканай сустрэчы з універсітэцкімі выкладчыкамі, новымі таварышамі па вучобе было многа хвалюючых дзён. Гэта, перш за ўсё, дні прыёмных экзаменаў. Пасябравалі. Тады мы яшчэ не ведалі, хто атрымае ганаровае права называцца студэнтам-завочнікам ардэнаноснага БДУ імя У. І. Леніна ў юбілейным годзе Савецкай улады. Неўзабаве атрымала паведамленне аб залічэнні на вучобу ва універсітэт, а праз некаторы час і выклік на першую ўстановачную сесію. Наступіла тое, пра што марыла доўгія гады: атрыманы студэнцкі білет, заліковая кніжка, праслуханы першыя лекцыі.**

**Лекцыі—гэта не школьныя ўрокі. Увесь час трэба старанна канспектаваць і слухаць, бо прапушчанае нават адно слова —мінус будучым ведам. Мы, завочнікі-першакурснікі, зразумелі добра гэта ўжо на першай лекцыі.**

**Ва універсітэце для мяне і многіх маіх сяброў адкрыты дзверы для многага новага, невядомага. Руская літаратура, сучасная руская мова, сценаграфія... гучаць цяпер для мяне зусім пановаму. Зразумела, што найперш, чым стаць высокакваліфікаваным спецыялістам,—наперадзе шмат выпрабаванняў, навука нікому лёгка не здаецца. А пакуль прайшлі першыя лекцыі, першыя знаёмствы. Ёсць сярод нас рабочыя, піянерважатыя, таварышы, якія ўжо закончылі адзін вну і ўчарашнія школьнікі. Есць і такія сярод нас, што ўжо працуюць у друку, на радыё. Як бачыце, розніца ва ўзросце ёсць, але гэта не перашкаджае сяброўству, якое ўстанавілася на нашым курсе. Больш старэйшыя вучаць семнаццацігадовых жыццю, семнаццацігадовыя ў сваю чаргу перадаюць старэйшым свой юнацкі запал душы і імкненне.**

**Мы ідзем па вуліцы сталіцы нашай рэспублікі, студэнты-завочнікі універсітэта, мы спрачаемся, марым, абмяркоўваем праслуханыя лекцыі, насцярожваемся і падоўгу задумваемся над тым, што неўзабаве пачнецца наша першая ў жыцці сесія ў вышэйшай навучальнай установе. Якая яна будзе, што прынясе яна з сабой? На гэтае пытанне адкажа час, а пакуль трэба старанна рыхтавацца і прайсці гэты рубікон паспяхова.**

**Галіна АДАМСОН.**

г. Ліда.

# АСПІРАНЦКІ ПРЫБОЙ

*Нездарма аспірантуру нашага універсітэта называюць кузняй навуковых кадраў. Сотні яе выпускнікоў з поспехам працуюць ва ўсіх вышэйшых навучальных установах рэспублікі, нямала іх чытае лекцыі для студэнтаў і працуе ў навукова-даследчых інстытутах краіны. Можна з упэўненасцю сказаць, што аспірантура БДУ пачэсна справілася з тымі задачамі, якія паставіла перад ёй Камуністычная партыя і савецкі ўрад пры адкрыцці яе ў 1927 годзе. Праз тры гады, у 1930 годзе, адбыўся першы ў гісторыі Беларусі выпуск аспірантаў, маладыя вучоныя ўліліся ў дружны прафесарска-выкладчыцкі калектыў БДУ.*

*І вось я ў думках параўноўваю лічбы 1927 і 1967; 23 і 82. Давайце паглядзім на суадносіны апошніх двух лічбаў. 23 — колькасць прынятых аспірантаў у 1927 годзе, а 82 — набор юбілейнага года. Прагрэсія ў прыёме аспірантаў ва ўніверсітэт, як бачым, унушальная.*

*Да таго ж трэба дадаць яшчэ і тое, што за апошнія гады вялікую работу праводзіць аспірантура па вучобе спаборнікаў, якія замацоўваюцца пры кафедрах, здаюць экзамены кандыдацкага мінімума, а пасля пад кіраўніцтвам вядучых вучоных універсітэта плённа працуюць над кандыдацкімі дысертацыямі. Цяпер у нас больш за тысячу спаборнікаў.*

*Калі з першага выпуску 1930 года ніводзін малады вучоны не быў накіраваны ў іншыя навучальныя ўстановы, то аспіранты выпуска гэтага года паедуць на працу, акрамя БДУ, у Гомель, Віцебск, Гродна, Брэст і іншыя гарады рэспублікі.*

*У гутарцы з намі загадчык аддзела аспірантуры зазначыў, што большасць аспірантаў-выпускнікоў падрыхтавалі да абароны кандыдацкія дысертацыі, у многіх яны знаходзяцца на стадыі завяршэння.*

*Многаабяцаючы набор аспірантаў і гэтага года. Ім выпала вялікае шчасце паступіць вучыцца ў юбілейным годзе Савецкай улады і закончыць у 40-ы юбілейны — выпуск маладых вучоных аспірантурай БДУ. Гэта вялікі гонар. Але ён будзе яшчэ большым, калі аспіранты з першых дзён напружана ўключацца ў вучобу, працу над сваімі даследаваннямі, каб іх энтузіязм рабіў такое ж упартае наступленне на навуку, як марскі прыбой на скалы.*

*І. РУДЗЕНСКІ.*

**Чым дарагая Уральская вобласць для студэнтаў нашага універсітэта, куды яны выязджаюць кожны год у час летніх канікул? Сваім рамантычным прасторам, гарачым сонцам, пралітым потам, жылымі дамамі, клубамі, бальніцамі, якія пабудаваны ўласнай рукой. І не толькі гэтым. Уральская вобласць — гэта месца, дзе гуляў са сваёй дывізіяй, знішчаючы ворагаў і дзе мужна загінуў легендарны герой грамадзянскай вайны Чапаеў. Гэта і месца, дзе адбывалася памятная сустрэча студэнтаў з пісьменнікам Міхаілам Шолахавым. Ёсць для нас у гэтай вобласці і яшчэ адно святое месца — месца, дзе пахаваны выдатны беларускі пісьменнік, паплечнік Янкі Купалы і Якуба Коласа Змітрок Бядуля. Кожны год на яго магілу лажацца букеты жывых кветак ад нашых будаўнікоў. Здымак справа і сведчыць аб той любві і павазе, якую праяўляюць выхаванцы універсітэта да слаўнага сына беларускага народа.**

**Тэкст А. ВЕЦІЧА.**
**Фота У. ФІЛАТАВА.**



# БУДЗЕМ ЗНАЁМЫ!

НОВАЯ ХВАЛЯ ПЕРШАКУРСНІКАЎ — НОВЫЯ ІМЕНЫ, І СА СПРОБАМІ ІХ ПЯРА УСЁ БОЛЬШ І БОЛЬШ МЫ БУДЗЕМ ЗНАЁМІЦЬ НАШАГА ЧЫТАЧА. А СЁННЯ З ВЕРШАМІ І КАРОТКІМІ АПАВЯДАННЯМІ ВЫСТУПЯЦЬ ДВОЕ ПЕРШАКУРСНІКАЎ — СТУДЭНТЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ — ВАЛЕРЫЙ ЗАКОННІКАЎ І АЛЯКСЕЙ ЯКІМОВІЧ. У ДОБРЫ ЧАС!..



ВОСЕНЬ. Фота А. КАДЗЕТА.

АЛЯКСЕЙ ЯКІМОВІЧ.

## МАЦІ

*ПОЗНЯЯ восень. Па небе паўзуць нізкія свінцовыя воблакі. Валіць пераменны з дажджом снег. Цяжкія камякі падаюць на голлі дрэў, на шурпатыя, парэпаныя камялі. Па гразкай, раз'езджанай дарозе ідзе жанчына. За спіною ў посцілцы мокрае, чорнае ад гнілі іржышча. Жанчына насілу перастаўляе ногі ў цяжкіх гумавых ботах, коўзаецца ў каляінах. Хлюпае пад нагамі гразь. Паабапал дарогі, бы чорныя прывіды, дрэвы. Раптам жанчына спынілася. На шчарбатай кары дрэва віднелася белая папера. Жанчына падышла бліжэй, папpавіла сівыя пасмы валасоў, што выбіваліся з-пад хусткі, прыгледзелася. На паперцы расплываліся чорныя літары:*

*«Усім, хто ўкрывае чырвонаармейцаў — расстрэл».*

*Пакутлівая грымаса скрывіла яе твар. Жанчына адвярнулася і шпарка пайшла далей.*

*Дома работа валілася з рук. Нарэшце не вытрымала. Яна зайшла ў хату і села на лаву. Са сцяны на яе глядзелі знаёмыя твары яе сыноў. Аднаму, меншаму — васемнаццаць, другому — дваццаць тры. Колькі гора яна нацярпелася з імі! Бывала, не было ў хаце ніводнай скарынкі хлеба. Тады яна ішла працаваць да людзей за дзесяць ці дваццаць вёрст адгэтуль.*

*Жылося цяжка. Дзеці гадаваліся без бацькі. Але вось арганізавалі калгас. Пабудавалі ёй новую хату. Сыны выраслі. Вучыліся аж недзе ў горадзе. Як яна радавалася імі. Не магла нацешыцца. Жанчына здымае са сцяны пажоўклыя здымкі, крысом хусцінкі выцірае пыл і доўга глядзіць на добрыя разумныя твары.*

*Непрыкметна падкрадваецца вечар. Паслабелая жанчына, не раздзяючыся кладзецца на ложак. Сумна і холадна ў пустой хаце. Не спіцца... Яна ляжыць і думае, а слёзы коцяцца і коцяцца па яе маршчыністых шчаках, на мулкую падушку. Ціха. Толькі недзе вецер бушуе ў коміне, ды дождж барабаніць у шыбы.*

*Ды вось нехта ціхенька пастукаў. Жанчына схапілася з ложка і падбегла да акна. Яе старэчыя, але яшчэ добрыя вочы разгледзелі некалькі постацей, якія прытуліліся да сцяны.*

*— Хто там?*

*— Тётенька, откройте. Мы красноармейцы. Третий день не кушали. Дайте хоть немного хлеба. Тётенька...*

*Жанчына сціла зубы. Задумалася. Перад вачыма стаіць праклятая паперка. А за акном, як з вядра, дождж лье і лье. Тады, яна ўспомніла тых, хто глядзеў на яе са здымка. Магчыма, і яны вось так туляюцца па завуголлі. Я іх маці, а ў гэтых таксама ёсць маці.*

*Глуха звякнула засаўка.*

*— Заходзьце, сыночкі, заходзьце. Праз парог пераступілі трое.*

*Жанчына шпарка завесіла вокны і запаліла лямпу. Цьмянае святло асвяціла абарваныя постаці. Жанчына, не гаворачы ні слова, дастала з печы чыгунок, завінела начоўкамі. Затым яна доўга шукала ў сундуку гарнітуры сваіх сыноў.*

*Назаўтра, калі яшчэ не паспеў рассеяцца золак, яны ішлі па той жа самай разбітай дарозе. Уперадзе ішла жанчына, а ззаду яе трое чырвонаармейцаў, для якіх гэтая старая, незнаёмая жанчына стала іх маці. А за іх спінамі важка крочылі фашысты з аўтаматамі наперавес.*

Валерый ЗАКОННІКАЎ.

## ТЫ ЧАКАЙ

Янцы Іарданавай

Ты жывеш у сонечнай
Балгарыі,
Я — у Беларусі баравой.
Для мяне твой кожны
ліст, як мара,
Для мяне, як казка,
вобраз твой.
Як успыхнуць
чырванню ранеты,
Ранкам золкім
выйду на шашу.
Ты чакай, я да цябе
прыеду,
А пакуль што —
толькі напішу.

## ЛЕС

**Я заўсёды пішу аб лесе,
Ў кожным вершы аб ім
штосьці ёсць.
Мае вершы з ягоных песень
Бралі музыку і прыгажосць.
Лес!
Цябе параўнаю з сусветам.
Дрэў тут больш, чым на
небе зор.
Не для буйнага дзікага
ветру
Твой дзівосны лясны
прастор.
Верасовыя сцежкі—арбіты.
Паспрабуй, адшукай сваю.
Сонцам, водарам хвой
абліты
На пачатку жыцця стаю.
Па якой пайсці невядома,
Каб жыццё вывучаць
не з кніг.
...Усе дарогі вядуць дадому,
Колькі б ты не ішоў па іх.**

## ЯНЫ ЖЫВУЦЬ

Чакаюць лета клёны
на паляне,
Укрыўшы плечы ў белыя
снягі,
А сосны хіляць голле
у дзялянцы,
Ім больш не заспяваць
вясною гімн,
Ім не стаяць пад цёплым
звонкім ліўнем,
Не гушкаць на галінках
птушанят.
І хоць падсочак раны
загаілі,
Ды ўжо апошняга чакаюць
дня,
Калі пад стук сякеры
уладарнай
На мяккі мох паложаць
галаву.
Але пакуль той страшны
час не ўдарыў,
Яны жывуць.
У маці на дзяцей адна
надзея.
І сосны, нібы маці, ад бяды
Укрылі ад шалеючай завеі
Сваю замену—соснік
малады.

# ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ПАДЫХОД

*Фельетон*

— Нашым першакурснікам цяпер здорава пашанцавала.

— Чаму? Ты маеш на ўвазе тое, што іх не паслалі ў гэтым годзе на бульбу?

— Не, я хацеў сказаць іншае. На дапамогу калгасам яны з задавальненнем паехалі б, і, вядома, пасля папоўнілі б упушчаны для вучобы час. Яны нічога не страцілі б, а вось, не паехаўшы, нешта для сябе знайшлі, прытым істотнае. Дзякуючы бульбе першакурснікі амаль цэлы месяц сустракаліся і ў інтэрнатах, і ў вучэбных карпусах толькі з выпускнікамі, пасябравалі з імі, атрымалі ад іх многа карысных парад...

Гэтую гутарку двух студэнтаў універсітэта я выпадкова падслухаў у аўтобусе. Відаць, таварышы мелі рацыю: застаўшыся адзін на адзін з выпускнікамі, першакурснікі хутчэй сышліся з імі і маглі пераняць каштоўны вопыт у тых, хто ўжо заканчвае курс вучобы. Але размова ёсць размова. Мне захацелася самому пераканацца, ці так гэта.

Прыязджаю ў інтэрнат на Паркавую магістраль. Сапраўды першакурснікі і выпускнікі вядуць сябе як старыя, добрыя знаёмыя. Падцвердзілася і тое, што старэйшыя даюць сваім новым калегам каштоўныя парады.

У ленпакоі я застаў каля дзесятка студэнтаў. Яны аб нечым спрачаліся. Прыслухоўваюся. Ага, размова ідзе аб тым ці трэба ўжо цяпер рыхтавацца да экзаменаў.

— Варта, — упэўнена даказвае хлопец з вельмі прыгожымі бакенбардамі, — але як?

Вы я гляджу ўзяліся штудыраваць падручнікі, першакрыніцы. Дарэмна. Не з гэтага трэба пачынаць. Здаваць экзамен вы будзеце не падручніку, а выкладчыку. А што вы аб ім ведаеце? Амаль нічога?

— Ну як жа, — умяшаўся я, — выкладчык-дацэнт, выдаў дзве кнігі...

— Вось, вось яно вечнае заблуджэнне: дацэнт, аўтар кнігі!.. А ці любіць ён паляванне, за якую футбольную каманду хварэе, як адносіцца да падлёднага лову рыбы? Не ведаеце? І з такім багажом збіраецеся ісьці да яго здаваць экзамен? Магу цяпер сказаць, што двойкі вам не мінуць.

Чым больш працягвалася гутарка, тым больш я здзіўляўся вопыту гэтага выпускніка. Між іншым, вучыць розуму першакурснікаў яму дапамаглі і іншыя. Адчувалася, што да здачы экзаменаў яны адносяцца, як да вельмі сур'ёзнай дзяржаўнай справы.

— Першае, што трэба для поспеху, — даказвалі яны, — гэта індывідуальны падыход да кожнага экзаменатара. Аб ім студэнт павінен ведаць больш, чым ён сам аб сабе: грамадскія і асабліва асабістыя інтарэсы, моцныя і слабыя бакі. Усё гэта дазволіць выпрацаваць правільную стратэгію і тактыку здачы экзаменаў.

Што такое стратэгія і тактыка? Эх молада-зелена! Не шукайце ў слоўніку. Стратэгія — гэта наступленне ці абарона на экзамене, тактыка ж абазначае, як весці наступленне ці абарону, якія рысачкі характару або якія інтарэсы выкладчыка выкарыстаць. Гэта цэлая навука, пазнаць якую ўжо пажадана на першым курсе.

Праўда, — спрачаліся наперабой выпускнікі, — цяжкасць тут не толькі ў тым, што пакуль па данай навуцы няма ніякіх дапаможнікаў. Кожны выкладчык — асобная адзінка. Магчыма, што да яе не падыдзе ніводная мерка, з якой вы падыходзілі да іншых. Дарэчы, вопыт падказвае, што і ў гэтай складанай справе ёсць агульныя заканамернасці. Ну, напрыклад, амаль беспамылкова можна аднесці любога выкладчыка да таго ці іншага тыпу, што вельмі важна.

Ёсць два тыпы экзаменатараў: думаючыя і фармалісты. Для першых у адказе важнае значэнне мае думка, змест, для другіх — форма. Першы тып мае свае падтыпы. Скажам, некаторым выкладчыкам падабаецца слухаць свае думкі, іншым — вашы думкі, трэцім — і тыя і другія. Другі тып таксама неаднародны. У яго трапляюць такія, якія зніжаюць адзнаку за беднасць вашай мовы, іншыя ж звяртаюць галоўную ўвагу на вымаўленне асобных слоў.

Дык вось, калі правільна падвесці экзаменатара пад тып, то стане зразумелым, як з ім змагацца. Пры адказе асобам першага тыпу рэкамендуецца: ці выкладаць як мага больш асабістых думак, роздуму (пры гэтым трэба часцей ужываць словы «Я лічу...», «Я не згодзен...», «па-майму цвёрдаму перакананню...» і гэтак далей), ці па магчымасці трэба найбольш поўна пераказваць думкі, пачутыя на лекцыях данага экзаменатара, тут найбольш ужываемыя выразы: «як вы нас вучылі...», «як сказана ў вашай брашуры» і г. д.).

Трапіўшы да прадстаўніка другога тыпу, трэба мець на ўвазе наступнае. Адведзены для падрыхтоўкі да адказа час выкарыстаць для складання звязанага і вобразнага расказа, каб пасля ваша мова лілася непарыўным красамоўным патокам. Вядома, тут без сродкаў індывідуальнага выкарыстання нельга абыйсціся. Маюцца на ўвазе шпаргалкі, як іх яшчэ не панавуковаму называюць.

Мне здалося, што ў ленпакоі стала зусім цесна. Так і ёсць сюды набілася шмат першакурснікаў. Чаго добрага, падумаў я, і мяне пераканаюць гэтыя выпускнікі, што ёсць новая навука... Вось забыўся, як жа яе называюць? Ах, так, успомніў — індывідуальны падыход. Я праціснуўся да выхаду і кінуўся да аўтобуса.

Даніла ШЫЛА.

## ЗАПРАШАЕМ ВУЧЫЦЦА

Камітэт камсамола аб'яўляе прыём рабочых горада Мінска на курсы па падрыхтоўцы для паступлення ва універсітэт у 1968 годзе. Курсы працуюць на грамадскіх пачатках. Падрыхтоўка будзе весціся па наступных дысцыплінах — гісторыя, фізіка, матэматыка, хімія, геаграфія, руская мова і літаратура, журналістыка і замежная мова.

Заняткі два разы ў тыдзень, з 16 кастрычніка. Заявы прымаюцца ў камітэце камсамола (пакой 207, другі паверх галоўнага корпуса) з 9 да 17 гадзін штодзённа.

Даведкі па тэлефоне Б-2-65-72.

Камітэт камсамола.

АТ 17609 Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106, тэл. Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Рэдактар М. ЮСЬКА. Зак. 1536